**ЧАРНЯ́ЎСКАЯ** Леаніла Усцінаўна (16.11.1893, в. Таргуны Докшыцкага р-на — 26.9.1976), пісьменніца, педагог. Жонка М.*Гарэцкага*. Скончыла Марыінскае вышэйшае вучылішча ў Вільні (1910). З 1911 настаўнічала, з 1919 выкладала ў Віленскай бел. гімназіі. З 1923 жыла ў Мінску, у г. Горкі (Магілёўская вобл.). З 1932 у г. Вятка, пас. Пясочня (цяпер Калужскай вобл.), з 1947 у Ленінградзе. Аўтар зборніка «Дзяціныя гульні» (1919), дзе прадставіла і апрацавала 27 нар. гульняў (пераважная большасць — з уласных запісаў). Нотныя тэксты да гульняў «Верабей», «Яшчур», «Шастак» былі зроблены бел. піяністкай і кампазітарам М.Кімант-Яцынай. Уключыла ў свае чытанні «Родны край» (1919) казкі са зборніка А.Сержпутоўскага, нар. песні розных жанраў. У сваіх успамінах «Памяці сына» і «Як складалася кніжка народных песень» расказала пра гісторыю стварэння зборніка М.*Гарэцкага* і А.*Ягорава* «Народныя песні з мэлёдыямі» (1928), цалкам складзенага з песень, запісаных ад маці пісьменніка А.*Гарэцкай*; пра ўдзел у яго падрыхтоўцы кампазітара М.Аладава і ўплыў запісаных песень на яго творчасць. Песні родных мясцін, а таксама вывучаныя на радзіме мужа, у в. Малая Багацькаўка, Ч. пранесла праз усё жыццё.

*Літ.*: Гарэцкая Г. Невычэрпныя крыніцы // Мастацтва Беларусі. 1988. № 3.

*У. А. Васілевіч.*

**ЧАРО́Т** Міхась (сапр. Кудзелька Міхаіл Сымонавіч; 7.11.1896, г.п. Рудзенск Пухавіцкага р-на — 29.10.1937), паэт, драматург, празаік, грамадскі дзеяч. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1917). У пачатковы перыяд творчасці працягваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ